# Памятка аб правах суб’екта персанальных даных і механізме іх рэалізацыі

У адпаведнасці з главой 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 07.05.2021 № 99-З «Аб абароне персанальных даных» (далей - Закон) суб’ект персанальных даных мае права:

адклікаць сваю згоду на апрацоўку персанальных даных у любы час без тлумачэння прычын шляхам падачы ў ААТ «ААБ Беларусбанк» (далей – аператар) заявы ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента, або ў форме, з дапамогай якой атрымана яго згода;

атрымліваць шляхам падачы аператару заявы ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента, бясплатна, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, інфармацыю, якая датычыцца апрацоўкі сваіх персанальных даных і ўтрымлівае:

- найменне аператара і яго месца знаходжанне;
- пацвярджэнне факта апрацоўкі персанальных даных аператарам (упаўнаважанай асобай);
- персанальныя даныя і крыніца іх атрымання;
- прававыя падставы і мэты апрацоўкі персанальных даных;
- тэрмін, на які дадзена яго згода;
- найменне і месца знаходжання ўпаўнаважанай асобы, калі апрацоўка персанальных даных даручана такой асобе;
- іншую інфармацыю, прадугледжаную заканадаўствам;

патрабаваць ад аператара ўнясення змяненняў у свае персанальныя даныя ў выпадку, калі персанальныя даныя з’яўляюцца няпоўнымі, састарэлымі або недакладнымі, шляхам падачы аператару заявы ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента, з прыкладаннем адпаведных дакументаў і (або) іх завераных ва ўстаноўленым парадку копій, якія пацвярджаюць неабходнасць унясення змяненняў у персанальныя даныя (копіі прадстаўляемых дакументаў павінны быць завераны арганізацыяй/органам, які выдаў арыгіналы дакументаў, іншым спосабам, прадугледжаным заканадаўствам);

атрымліваць шляхам падачы аператару заявы ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента інфармацыю аб прадастаўленні сваіх персанальных даных трэцім асобам адзін раз у каляндарны год бясплатна, калі іншае не прадугледжана Законам і іншымі заканадаўчымі актамі;

патрабаваць ад аператара шляхам падачы яму заявы ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента, бясплатнага спынення апрацоўкі сваіх персанальных даных, уключаючы іх выдаленне, пры адсутнасці падстаў для апрацоўкі персанальных даных, прадугледжаных Законам і іншымі заканадаўчымі актамі;

атрымліваць адказы аб выніках разгляду сваіх заяў аб рэалізацыі правоў як суб’екта персанальных даных у форме, якая адпавядае форме падачы заявы, калі ў самой заяве не пазначана іншае;

абскардзіць дзеянні (бяздзейнасць) і рашэнні аператара, якія парушаюць яго правы пры апрацоўцы персанальных даных, ва ўпаўнаважаны орган па

абароне правоў суб’ектаў персанальных даных – Нацыянальны цэнтр па абароне персанальных даных, у парадку, устаноўленым заканадаўствам аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб.

Заява суб’екта персанальных даных павінна ўтрымліваць:

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), адрас яго месца жыхарства (месца знаходжання);

дату нараджэння;

ідэнтыфікацыйны нумар суб’екта персанальных даных, пры адсутнасці такога нумара – нумар дакумента, які сведчыць асобу суб’екта персанальных даных, у выпадках, калі гэта інфармацыя пазначалася суб’ектам персанальных даных пры дачы сваёй згоды аператару або апрацоўка персанальных даных ажыццяўляецца без згоды суб’екта персанальных даных;

перадачу сутнасці патрабаванняў суб’екта персанальных даных;

асабісты подпіс або электронны лічбавы подпіс суб’екта персанальных даных.

Пры падачы заявы суб’ект персанальных даных не павінен абгрунтоўваць свой інтарэс да запытваемай інфармацыі.

Заўвага: ААТ «ААБ Беларусбанк» мае права адмовіць суб’екту персанальных даных у задавальненні патрабаванняў аб спыненні апрацоўкі персанальных даных пры наяўнасці падстаў апрацоўкі, прадугледжаных заканадаўствам, у тым ліку, калі персанальныя даныя з’яўляюцца неабходнымі для заяўленых мэт іх апрацоўкі, а таксама адмовіць у задавальненні іншых патрабаванняў у выпадках, устаноўленых заканадаўствам.